**Мельнікава Т.М. (Мінск)**

# Ваенная лірыка Максіма Танка як адна з канстантаў інтэрнацыянальнага выхавання моладзі

Сістэме адукацыі належыць вядучая роля ў грамадзянскім станаўленні моладзі, выхаванні ў яе адданасці сваёй краіне, любові да іншых народаў свету. Дынаміка сацыякультурных пераўтварэнняў у Рэспубліцы Беларусь, сучаснае нестабільнае становішча ў свеце актуалізавалі гуманістычную парадыгму выхавання – фарміраванне праз літаратуру сацыяльна і маральна сталай асобы, якой належаць лепшыя якасці грамадзяніна, працаўніка, міратворца. На сучасным этапе развіцця нашага грамадства інтэрнацыянальнае выхаванне моладзі набывае асаблівую вастрыню і актуальнасць.

З канца XX ст. адзначаецца дэнацыяналізацыя выхавання ў выніку эканамічных, маральных крызісаў грамадства і асобы, страты ранейшай сістэмы каштоўнасцей. Сёння як ніколі трэба стымуляваць уздым высокіх пачуццяў і настрояў у працэсе інтэрнацыянальнага выхавання.

Вынікі даследаванняў расійскіх, беларускіх і іншых вучоных (Д. Бугаёў, С. Вішнякова, В. Крысько, С. Юрчак, Г. Арлова, А. Барзянкоў і інш.) падкрэсліваюць актуальнасць і неабходнасць работы па інтэрнацыянальнаму выхаванню моладзі ва ўстановах сярэдняй і вышэйшай адукацыі, што прымушае вярнуцца да мінулых скарбаў савецкай сістэмы выхавання, больш універсальнай, сацыягуманітарнай, інтэрнацыянальна і патрыятычна арыентаванай адукацыі. Гэта сістэма дапамагла сфарміраваць сапраўды моцную пароду людзей, якія вытрымалі самыя цяжкія выпрабаванні і прыйшлі да перамогі, як піша пра сваіх сучаснікаў знакаміты беларускі пісьменнік Максім Танк: “Мы пазналі за гэты час многа: / Поле бітвы, паўночную сцюжу, / Цяпло братняй спагады і дружбы / І цяжкія шляхі перамогі” [4, с. 20].

Адна з важных характарыстык інтэрнацыяналізму – яго сацыяльны змест. Як падкрэслівае С.І. Ожэгаў, інтэрнацыяналізм – гэта “идейно-политический принцип, провозглашающий, в противоположность национализму, равенство, солидарность и сотрудничество всех народов” [1, с. 217]. Паводле слоўніка замежных слоў, інтэрнацыяналізм (лац. inter паміж + nation (nationis) народ) – “принцип солидарности всех народов…; уважение и признание социально-исторического и культурного наследия народов всего мира” [2, с. 198]. Роўнасць, салідарнасць і супрацоўніцтва ўсіх народаў апісваў вельмі грунтоўна ў сваёй ваеннай лірыцы М. Танк. Беларускі пісьменнік выразна адлюстроўваў інтэрнацыяналізм вялікай сацыялістычнай сям’і, дзе не было месца нацыянальнай выключнасці, нацыянальнаму эгаізму: “Таварыш, адкуль ты – усё роўна, / З Масквы ці з усходніх шляхоў. / …Хутчэй нясі катам расплату / За смерць сваіх родных братоў” [4, с. 39–40]. Кожнае ваеннае злучэнне Савецкай Арміі было інтэрнацыянальным па сваім кантынгенце. Напрыклад, Брэсцкую крэпасць абаранялі прадстаўнікі больш за 30 нацыянальнасцей, прадстаўнікі 100 нацыянальнасцей разам вызвалялі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

11 еўрапейскіх дзяржаў, уздымалі з блакады Ленінград, адстойвалі Маскву, Сталінград, Курскую дугу ("Быў чэрвень. / Эшалоны рана / На фронт спяшаліся, ішлі, / Прыбраныя цвятамі Казахстана, / Сібірскай хвояй, сінявой ліманаў, / Калоссямі украінскай зямлі" [4, с. 22]). Пісьменнік з гонарам піша, што кожнаму з інтэрнацыянальнага войска ("Людзі з розных старон – / Масквічы, украінцы, казахі…") "рана адна не давала спакою, / І мы ўсе да відна / Рыхтавалі паходную зброю" [4, с. 49]. Каб абараніць сваё права на жыццё, права будаваць яго на аснове сацыяльнай справядлівасці і роўнасці, усе нацыі і народнасці моцнай савецкай дзяржавы проціпаставілі фашызму матэрыяльныя і духоўныя рэсурсы, адданасць сваёй Бацькаўшчыне, інтэрнацыянальную еднасць: казацкую рашучасць ("… у руках / Клінок казака / Над ворагам свішча расплатай" [4, с. 37]); каўказскую шчырасць ("Ўдвух мы, разведчыкі, цёмнаю ноччу / край ўспаміналі… / Мой сябра з Тбілісі / апавядаў пра сады, кіпарысы, пра неабсяжнае Чорнае мора / і пра высокія снежныя горы" [4, с. 64]). Тое ж мы чуем у эстонскага паэта Ральфа Парвэ ў вершы "На перекрёстке": "Мы из разных собрались дивизий. / Вот латыш – Москву он защищал, / Смуглый уроженец Кутаиси, / Русский, что махоркой угощал, / Белорус и украинец рядом, / Сибиряк, что шёл от Сталинграда, / И эстонец… / Мы пришли за всем, / Чтобы счастье улыбнулось всем!" [3, с. 113]. Слава пра братні саюз, які з перамогай рухаўся да логава фашыстаў, працягнулася далёка на захад ("Нас не пыталіся, хто мы, / У гэтыя дні за граніцай. / Братам мы даўно знаёмы, / А ворагі ведалі мсціўцаў" [4, с. 71]). З гэтымі братамі "дзяліліся хлебам, / Што вырас у стэпах данецкіх / Пад зорным, апаленым небам…" [4, с. 72].

Ад імя ўсіх савецкіх народаў М. Танк звяртаецца да польскіх грамадзян і, як латышскі паэт Я. Судрабкалн у кнізе «В братской семье», заклікае "злучыць братнія далоні" [4, с. 28].

Любоў салдата да сваёй "малой радзімы", да хаты, дзе ён нарадзіўся, перадаецца Танкам у вершы "Мы ў свой горад прыйшлі". Радкі паэта, звернутыя да аднаго чалавека – да салдата, да каханай, – адначасова ўвасабляюць думкі і пачуцці многіх. Праз адну сям'ю паказваюцца вялікія памеры трагедыі ў вершы М. Танка "Н.А.", які пераклікаецца з пранізліва асабістым вершам А. Суркова "Зямлянка". У Танка таксама ёсць верш з сугучнай назвай – "У зямлянцы", дзе адчуваюцца павага і прызнанне культурнай спадчыны Украіны ("Разгараецца ў небе зорны шлях. / Цішыня залягла ў бліндажах, / Толькі чутна, як друг мой і сусед / Запявае ў цішы "Запавет"). Тэма ўсенароднага подзвігу натхняла паэтаў розных нацыянальнасцей: Я. Купалу, М. Рыльскага, П. Тычыну, Д. Джабаева, Г. Леанідзэ, К. Куліева, А. Куляшова і інш. Пісьменнікамі раскрываюцца тыя духоўныя каштоўнасці, што нараджаліся ў сумеснай барацьбе супраць фашызму. Такім чынам адлюстроўваюцца ўзаемапранікненне і ўзбагачэнне суседніх культур: "Мы пяём Кабзара "Запавет" [4, с. 59], запавет дзядоў, бацькоў берагчы сваю радзіму.

Ваенная лірыка М. Танка адзначаецца вобразнасцю, рытміка-інтанацыйным ладам ("Кожны марыць вярнуцца да родных крыніц, / Дзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вада маладосцю тваёю звініць, / Дзе вачамі тваімі глядзіць зара, / Дзе зямля захавала твой першы след…” [4, с 59]), што характарызуе яго мастацкае мысленне.

Танк не замыкаецца на тым, што вайна прынесла гора толькі Беларусі, неабсяжнасць трагедыі чуецца ў наступных радках: “Мо нейкая крыўда забыта / На нашых бясконцых прасторах, / Ляжыць, скамянеўшы, гранітам, / Шуміць па Палессі ракітай / Ці стогне ля Чорнага мора…” [4, с. 72]. Жудасныя вынікі вайны, у якой загінулі прадстаўнікі розных народаў, крычаць у вершы “Трасцянец”: “На абгарэлых кацялках салдацкіх / І на біклагах шмат было імён, / Кароткіх надпісаў / На розных мовах свету. / Вось якар, выпісаны з зоркай, а ніжэй – / Імёны маракоў, і даты нараджэння іх, / І даты смерці. / Вось толькі адрасы / У Мінск, у Прагу, у Белград. / Як іерогліфы, / Шляхі усходніх літар, / Лацінскі алфавіт, / І словы з бібліі, і словы псалмаў, / Якія бога не знайшлі ў той дзень” [4, с. 94–95]. Тыя ж смутак і горыч звіняць у вершы “На брацкай зямлі”. Паэт упэўнены, што польская зямля “брацкая, свая зямля”, таму што яна прыняла загінуўшых “байцоў, якім больш трох гадоў / вайна / Не дазваляла вочы замыкаць” з павагай, смуткам і пашанай: “зялёныя хваёвыя вянкі” польскі народ “рукамі беражна звязаў” і “на перадавую іх прынёс” [4, с. 60].

Дасведчанасць М. Танка і інтэлектуальна-культурная насычанасць яго творчасці ўражваюць тым, што характарызуюцца асабістай актуальнасцю, сугучнасцю з сусветнымі праблемамі XXI стагоддзя. Змест ваенных твораў пісьменніка падкрэслівае, што інтэрнацыяналізм 40-х гадоў XX стагоддзя прасякнуты ідэямі адзінства народаў у барацьбе за мір, супрацоўніцтва, глыбокай павагай яго носьбітаў да ўсіх людзей добрай волі, незалежна ад іх нацыянальнай і расавай прыналежнасці.

Ваенная лірыка М. Танка цікавіць не толькі як узор мастацкай дасканаласці, але і як асаблівая карціна свету, дзе на першы план выходзяць духоўна-ідэалагічныя канстанты: прынцыпы дабра, справядлівасці і гуманізму, патрыятызм і развітая інтэрнацыянальная свядомасць.

Літаратура

1. Ожегов, С.И. Словарь русского языка: ок. 57 000 слов / под ред. чл.-корр. АН СССР Н.Ю. Шведовой. – 18-е изд., стереотип. – М. : Рус. яз., 1986. – 797 с.

2. Словарь иностранных слов. – 11-е изд., стереотип. – М. : Рус.яз., 1984. – 608 с.

3. Стихи о Великой Отечественной. Книга вторая. – М. : Худож. Литература, 1985 г. – 384 с.

4. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Бел. навука, 2006–2012. – Т. 2 : Вершы (1939–1954). – 200.6 – 556 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ